І. А. Гімпель

БЕЛАРУСАЧКА

2

А. В. Вольскі
І. А. Гімпель

БЕЛАРУСАЧКА

Падручнік па літаратурным чытанні
для 2 класа ўстаноў, якія забяспечваюць
атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі,
з рускай мовай навучання

slovo.ws

Зацверджана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Выданне чацвёртае, дапрацаванае

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2006

все учебники на www.slovo.ws

Все учебники на www.slovo.ws

К 811.161.3(075.2=161.1)
К 81.2Беи-922
В71

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра беларускай і рускай моў
ігілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова
андыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры
Л. І. Шапавалава);
етадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў
пачатковай школы № 103 г. Мінска

Умоўныя абазначэнні:

? — пытанні і заданні
* — заданні павышанай цяжкасці
📖 — слоўнік

SLOVO.WS

© Вольскі А. В., Гімпель І. А., 2006
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2006

N 985-02-0836-8

все учебники на www.slovo.ws

Не проста ў словы я гуляю —
На мове роднай размаўляю...

Мікола Мятліцкі

Маленькі чалавек у вялікім свеце

Алесь Бадак

А ці ведаеш ты, дзе ты жывеш? «Ну вядома ж, ведаю,— напэўна, адкажаш ты,— дома!» Але што такое «дом»? Правільна, гэта кватэра ці хата, дзе ты спіш, гуляеш, ясі, глядзіш тэлевізар,— гэта твой дом. Там яшчэ жывуць твае мама, тата, брацікі, сястрычкі. Там у цябе ёсць шмат цацак і кніжак.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Але вось ты з татам і мамай паехаў у іншы горад ці вёску. У госці. Значыць, твой дом — не толькі твая кватэра, але і ўвесь Мінск, цэлы горад! А нехта жыве ў вёсцы. Значыць, яго дом — цэлая вёска...

А цяпер паглядзі навокал. Бачыш вунь той лес? Гэта твой лес. Таму што ты можаш разам са сваімі татам і мамай у любы час пайсці ў яго ў грыбы ці ягады. Але гэта лес і ўсіх тваіх сяброў. І Валеркі, і Наташкі, і Марынкі, і Сяргейкі.

І рэчка, на якой ты дапамагаў старэйшаму брату лавіць рыбу, таксама агульная. Наша.

SLOVO.WS
Все учебники на www.slovo.ws

А ўсё гэта — і лес, і рэчка, і зямля, па якой ты ходзіш, і горад, у якім ты жывеш, і вёска, у якой жывуць твае бабуля і дзядуля,— усё гэта разам называецца адным словам — Радзіма. У яе і імя ёсць — Беларусь. Прыгожае імя, праўда?

Ну а людзі, якія жывуць у Беларусі, гэта значыць мы з табой, называюцца беларусамі. На хлопчыка гавораць беларус, а на дзяўчынку — беларуска альбо беларусачка.

SLOVO.WS

1. Якое імя ў нашай Радзімы?
2. Як называюцца людзі, якія жывуць у Беларусі?
3. Якім адным словам можна замяніць словы «Бацькаўшчына», «Айчына», «краіна»?
4. Прачытайце тэкст, пачынаючы са слоў «А ўсё гэта...». Правільна вымаўляйце словы з гукам [дз'].

все учебники на www.slovo.ws

Беларусачка

Алесь Бадак

Твар румя́ненькі,
Белая ху́стачка.
Я ўжо ведаю,
Я — белару́сачка!
І хачу
Так, як тата і мама,
Родны край свой любіць
Я таксама.

SLOVO.WS

?

1. З якім пачуццём аўтар піша пра беларусачку? Пацвердзіце словамі верша.
2. Знайдзіце і прачытайце ў вершы ўсе ласкавыя словы. Для чаго яны ўжыты?
3. Як вы разумееце выдзеленыя радкі верша?
4. Прачытайце верш выразна. Правільна вымаўляйце словы з гукам [ч].

все учебники на www.slovo.ws

Я — беларус маленькі

Мікола Маляўка

Я — беларус маленькі,
Спяшаюся да школы.
Як і бацькі, сумле́нны,
Рупліві і вясёлы.

Я — беларус маленькі
З блакітнымі вачыма.
Хачу і я, каб ле́пей
Жыла мая Радзіма.

Сумле́нны — чуйны, бездакорны.
Рупліві — клапатлівы, старанны.
Блакітны — светла-сіні.

1. Пра каго гаворыцца ў вершы?
2. Знайдзіце радкі, якія характарызуюць хлопчыка. Прачытайце.
3. Як вы разумееце апошнія радкі верша?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Радзіма

Артур Вольскі

Радзіма ў нас бязмежная,
спякóтная і снежная.
Радзіма ў нас лагóдная,
нібы матуля родная.
А самае галоўнае:
усе ёй дзеці
роўныя.

Спякóтны — вельмі гарачы.
Лагóдны — дабрадушны, ласкавы.

1. Пра што расказвае паэт у вершы? Якая наша Радзіма?
2. З кім аўтар параўноўвае Радзіму?
3. Што самае галоўнае для нашай краіны? Зачытайце.
4. Прачытайце верш хорам.

Прыказка

Родная зямля мякчэйшая за чужую пярыну.

SLOVO.WS
Все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Дарагая Беларусь

Леанід Прончак

Бор спявае,
Сонца свеціць.
Жыта спее ў палях.
Прыгажэйшая на свеце
Беларуская зямля.

Падрастай,
Маленькі буслік,
І да воблачкаў крыля́й.
Мы жывём у Беларусі —
Гэта наш спрадве́чны край.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Крыля́ць — махаць крыллямі, узлятаць.
Спрадве́чны — вельмі стары, які існуе здаўна, старадаўні.

1. Ці спадабаўся вам верш? Чым?
2. У якіх радках верша аўтар піша пра прыгажосць нашай зямлі? Прачытайце.
3. Як па-іншаму можна назваць верш?
4. Для каго Беларусь з'яўляецца спрадвечным краем? Чаму?
5. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання.
6. Вывучыце верш на памяць.

SLOVO.WS

Прыказка

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.

все учебники на www.slovo.ws

Верасень букеты
Запрасіў у школу...
Мар'ян Дукса



Развітанне з летам

Мар'ян Дукса

Верасень букеты
Запрасіў у школу.
Дзякуй, дзякуй, лета,
За спачы́н вясёлы.

Будуць доўга сніцца
Нам сцяжынкі гаю,

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Пахкія суніцы,
Раніца грыбная,

Зы́чны грай птушыны,
Песні ў паднябессі.
Даспявай, рабіна,
Ты без нас у лесе.

Спачы́н — перапынак у працы.
Зы́чны грай — гучны крык птушак.

?

1. Якія малюнкі лета апісвае аўтар? Знайдзіце адказ у вершы. Прачытайце.
2. Чаму паэт так назваў свой верш?
3. Растлумачце, як вы разумееце выдзеленыя радкі верша.
4. Падумайце, як трэба чытаць гэты верш — гучна і хутка або ціха і павольна. Чаму?
5. Прачытайце верш. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [дз’], [г], [ў].

все учебники на www.slovo.ws

Школа

Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні:

1. Куды прыйшлі дзеці?
2. Што яны нясуць у руках?
3. Хто іх сустрэў каля школы?
4. Які настрой у дзяцей?
5. *Пра што размаўляюць хлопчыкі?

все учебники на www.slovo.ws

Наташын букецік

Нічыпар Парукаў

Вясной мама ў кветніку ўскопвала градкі. Наташа памагала ёй.

Мама вынесла з хаты каляровы пакецік, насыпала Наташы на далонь дробненькіх зярнятак і сказала:

— Сей сама. Гэта будуць твае кветкі.

Дзяўчынка рассеяла зярняткі па ўсёй градцы, загрэбла граблямі так, як паказала мама. Мінула некалькі дзён, і на градцы ў кветніку густа зазелянелі кволенькія раслінкі.

І вось надышлі цёплыя летнія дні.

Усё лета Наташа даглядала свае кветкі. У кветніку расцвілі духмяныя рамонкі і астры.

А першага верасня Наташа нарвала вялікі букет і ўзяла з сабой у школу.

Радасна было дзяўчынцы занесці свайёй першай настаўніцы букет прыгожых кветак.

все учебники на www.slovo.ws

1. Ці можна па назве і ілюстрацыі вызначыць, аб чым пойдзе размова ў тэксце?
2. Дзе адбываюцца падзеі, якія апісаны ў тэксце? Калі?
3. Што сказала маці дачцэ вясной? Прачытайце.

?

4. Што зрабіла Наташа вясной? Што рабіла летам? Зачытайце.
5. Чаму радасна было дзяўчынцы несці букет першай настаўніцы?
6. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання той часткі тэксту, якая вам асабліва спадабалася.

slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Зазвініць званок

Артур Вольскі

Абрывае восень
за лістком лісток.
Сёння,
роўна ў восем,
зазвініць званок.

Дожджык ціхі
ў шыбы,
як назóла, б'е.
Ён шапоча нібы
нешта пра сябе.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

А мы сонца просім:
— Выгляні з аблок!..
Хутка,
роўна ў восем,
зазвініць званок.

Назóла — той, хто вельмі дакучае.

1. Пра што гаворыцца ў вершы? Зачытайце.
2. Што засмучае дзяцей? Аб чым яны просяць?
3. Якія восеньскія прыкметы апісвае аўтар? Прачытайце.
4. Якія прыкметы восені вы заўважылі ў прыродзе?
5. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [дж], [р], з апострафам.

Загадка

Зроду ён ні есць, ні п'е — песні голасна пяе і з урока на ўрок падаé свои галасок.

slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Сяброўкі ідуць у школу

Любоў Варанкова

I

Гэтыя некалькі дзянькоў праляцелі вельмі хутка, праляцелі, як жоўтыя лісцікі з бярозы, што сарваў і панёс з сабой вецер. Надышоў дзень першага верасня.

У гэты дзень Таня прачнулася вельмі рана. Яснае вераснёўскае сонца касымі праменнямі заглядала ў акно, і ў бабулі яшчэ палілася ў печы.

SLOVO.WS

II

Таня ўсхапілася з пасцелі і, шлёпаючы босымі нагамі, пабегла на кухню.

— Ты чаго падхапілася гэтак рана? — сказала бабуля.— У мяне яшчэ і снеданне не гатова!

— Дык і трэба, каб рана! — адказала Таня.— Ты, бабуля, мабыць, усё забыла!

— А што ж гэта я забыла?

— Бабуля, ды я ж сёння ў школу іду!

все учебники на www.slovo.ws

— Ну і чаго ж ты крычыш? — здзівілася бабуля.— У школе таксама ўрокі не з цямна пачынаюцца.

Тут яна выняла з печы патэльню, на якой шыпеў піражок, і сказала:

— Вось я табе і піражок спякла, з сабою возьмеш у школу. Бачыш, нічога я не забыла!

Таня пабегла на ганак мыцца. Шчокі і вушы адразу пачырванелі ад халоднай вады. Таня добра выцерлася ручніком, але паглядзела на свае рукі і зноў пабегла на ганак. Рукі ў яе былі абветраныя, карычневыя ад загару. Таня церла іх і намыльвала, церла і намыльвала...

— Ды хопіць табе ўжо! — сказала бабуля.

III

На снеданне прыйшла маці з малацьбы.

— Я зараз сама дачку ў школу збяру,— сказала яна.— Ану, ідзі сюды!

Яна дала Тані адпрасаваную сукенку, зашпіліла на ёй белы фартушок, сунула ёй

все учебники на www.slovo.ws

у кішэньку новую насовачку і сама расчасала Тані валасы. Расчасала і задумалася.

— А што ж нам з тваімі валасамі рабіць? Або падстрыгчы іх трэба, або коску заплесці.

— Коску заплесці! — сказала Таня.

IV

Маці дастала з камоды сіні каснічок і запляла Тані коску. Коска выйшла маленькая і закручвалася ўгору. Але Таня радавалася і ганарылася і ўсё крáтала яе рукою. Таня яшчэ ніколі ў жыцці не хадзіла з коскай!

Маці агледзела Таню з усіх бакоў, ці ўсё на ёй добра, і сказала:

— Вучыся, дачка, старанна, слухай, што настаўніца будзе казаць, набірайся розуму!

V

Таня піла чай і дзьмухала ў сподак, бо яна спяшалася, а чай быў гарачы і ніяк не астываў. У гэты час у акно заглянула Алёнка.

Таня паставіла сподак з чаем:

все учебники на www.slovo.ws

— Пойдзем?

Алёнка кіўнула галавой.

— Ды куды ж ты? — сказала Тані бабуля. — Ты ж хоць чай дапі!

Але Таня ўжо схапіла сваю сумку, якую яна падрыхтавала да школы, і выбегла на га́нак.

Спо́дак — невялікая талерка з падня-тымі берагамі, на якую ставіцца кубак або шклянка.

Камо́да — невысокая шафа для бя-лі́зны і розных хатніх рэчаў.

Га́нак — прыбудова з прыступкамі і навесам перад уваходам у хату.

Каснічо́к — стужка, якую ўплятаюць у валасы.

Кра́таць — дакранацца да чаго-не-будзь, варушыць.

1. Што зацікавіла вас у гэтым апавяданні?
2. Чаму Таня прачнулася першага верасня вельмі рана?

все учебники на www.slovo.ws

3. Як Таня рыхтавалася ў школу?
4. Які наказ маці дала дачцэ?
5. Прачытайце тэкст самі сабе і размяркуйце пункты плана ў адпаведнасці з часткамі тэксту.

?

План

1. Матчын наказ.
2. Хваляванне Тані і Алёнкі.
3. Маці збірае дачку ў школу.
4. Раніца першага верасня.
5. Размова Тані з бабуляй.
6. *Зрабіце малюнак да той часткі тэксту, якая найбольш вам спадабалася.

slovo.ws

Чаму партфель плакаў

Наталля Чарнабай

Пайшоў Цімафейка ў школу. Прывык за лета гойсаць па вуліцы да цемнаты, а тут урокі трэба вучыць, маляваць нешта, майстраваць.

Аднойчы прыйшоў ён са школы, кінуў партфель на ганак, а сам пабег з сябрамі ў

все учебники на www.slovo.ws

футбол гуляць. Выйшла сястрычка з дому, бачыць — ляжыць партфель без гаспадара. І рашыла: «Правучу я цябе, Цімошка! Будзеш ведаць, як партфель абы-дзе кідаць». Узяла і схавала партфель у кустах. Набегаўшыся, Цімафейка плюхнуўся на ложак са скібкай хлеба ў руцэ. А сон міжволі закалыхвае. І тут спахапіўся: «Ой, урокаў жа не зрабіў!» Устаў, ходзіць па хаце, партфель шукае.

Сястрычка глядзела, глядзела, а потым і кажа:

— Ты партфель шукаеш? Я ўдзень бачыла, як ён на ганку плакаў, скардзіўся: «Не беражэ мяне Цімошка, кідае ў гразь, нагамі месіць». Сказаў, што ўцячэ ад цябе. Бяжы хутчэй на двор, можа, ён дзе за куст зачапіўся. Знойдзеш, пакуль не позна.

все учебники на www.slovo.ws

Цімафейку як ветрам здзьмула з хаты. Тупае па ганку, узіраецца ў цемру, слёзы бягуць па твары — боязна ўсё ж. Убачыў партфель у кустах, схапіў, прыціснуў да грудзей і, радасны, прынёс у хату.

— Во, знайшоўся! Не захацеў ад мяне ўцячы!

Сястрычка ўсміхаецца хітравата, а Цімафейка гладзіць партфель ласкава, як ката, ды прыгаворвае:

— Міленькі, прабач, калі ласка! Я больш ніколі не буду пакідаць цябе на ганку.

SLOVO.WS

1. Чаму апавяданне так названа?
2. Знайдзіце ў тэксце сказ, у якім даецца адказ на пытанне «Чаму партфель плакаў».
3. Растлумачце, як вы разумееце выраз «Як ветрам здзьмула з хаты»?
4. Чаму Цімафейка прасіў прабачэння ў партфеля?
5. *Прачытайце тэкст самастойна і падрыхтуйцеся да чытання ўголас. Правільна вымаўляйце гукі: [дз], [ч], [ж], [ц].

все учебники на www.slovo.ws

Два таварышы

Леў Талстой

Ішлі лесам два таварышы, і выскачыў на іх мядзведзь. Адзін кінуўся бегчы, узлез на дрэва і схаваўся, а другі астаўся. Што было яму рабіць? Ён упаў на зямлю і прыкінуўся мёртвым.

Мядзведзь падышоў да яго і стаў нюхаць. Ён і дыхаць перастаў.

Мядзведзь панюхаў яго твар, падумаў, што мёртвы, і адышоў.

Калі мядзведзь пайшоў, таварыш злез з дрэва і смяецца. «Ну што,— кажа,— мядзведзь табе на вуха гаварыў?»

«А ён сказаў, што кепскія тыя людзі, якія ў небяспецы ад таварышаў уцякаюць».

1. Што вам не спадабалася ў паводзінах аднаго з таварышаў? Чаму?
2. А як бы паступілі вы?
3. Прачытайце апошні абзац тэксту і адкажыце, як вы разумееце яго сэнс.

slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

4. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Пры чытанні звярніце ўвагу на знакі прыпынку.

? 5. Якія ілюстрацыі можна намаляваць да тэксту? Колькі?

6. Паспрабуйце пераказаць тэкст сваімі словамі.

Ветлівыя словы

Тадзіяна Кляшторная

«Калі ласка», «дзякуй»,
«Добры дзень» —
Ветлівыя словы
Чую ад людзей.

Я таксама буду
Імі даражыць:
З ветлівымі словамі
Лёгка жыць.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

1. Якія ветлівыя словы вы яшчэ ведаеце? Назавіце іх.
2. Чаму з ветлівымі словамі лёгка жыць?
3. Прачытайце верш шэптам і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.
4. Вывучыце верш на памяць.

Гульня

Уладзімір Ліпскі

Гаваркое Г гайдала Галку на галіне, прыгаворвала:

— Галка-Галка, галодная графіня, не ганяй галубоў у галубятні, не грызі гарбузікаў. Гэй-гоп-гуленькі! Гэй-гоп-гуленькі! Гэй-гоп-гуленькі!..

Гена, Грыша, Груня, Гэля гулялі ў гарадкі. Глядзяць — Г гайдае Галку, гукаюць:

— Гэй, Г, пагуляй з намі ў гарадкі.

Г кінула гайдаць Галку:

— Гушкайся, Галка, сама. Я пагуляю ў гарадкі.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Галка-гультайка ў гвалт:

— Г, гайдай Галку!

Галка галёкала. А Г бегла да Гены, Грышы, Груні, Гэлі.

Гуртам за горадам гулялі ў гарадкі.

1. Які гук часцей за ўсё ўжываецца ў тэксце «Гульня»?
2. Як [г] вымаўляецца ў беларускай мове? А ў рускай? Свае адказы пацвердзіце прыкладамі.
3. *Прачытайце тэкст самастойна.

все учебники на www.slovo.ws

Хто я?

Сяргей Пагарэлаўскі

Кім ужо не быў я толькі!
Сто імён змяніў — не меней:
гэта ж я адразу
ШКОЛЬНІК,
СЫН,
УНУЧАК,
БРАТ,
ПЛЯМЕННІК.
Для Міколкі я — ДРУЖБАК
і ТАВАРЫШ — гэта так.

SLOVO.WS

1. Чаму на адно пытанне «хто?» столькі адказаў у хлопчыка? Патлумачце (школьнік, бо вучыцца ў школе...).
2. Замяніце загаловак «Хто я?» на «Хто ён?». Ці зменіцца пытанне? А імёны?
3. Навучыцеся чытаць верш выразна. Вымаўляйце словы, якія напісаны вялікімі літарамі, з інтанацыяй пералічэння.

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

Загадкі

Міхась Пазнякоў

* * *

Бацька радасна люляе
Сотні дзетак на руках.
Шапка ў бацькі лісцяная,
Дзеткі ўсе ў капелюша́х.

* * *

Прысеў пад плотам
Рыжы кот,
Павесіў доўгі хвост
На плот.

* * *

Сакавіты, круглаваты
Здаравяка гэты.
Нам патрэбен на салаты
І на вінегрэты.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Мы не заўважылі і самі,
Як восень па зямлі пайшла...

Пятро Прыходзька

Восень

Вера Вярба

Восень, мая чарадзейка,
Ходзіць па лесе, пяе,
І залатая жале́йка
Песні разносіць яе.

Восень, прыйдзі ты ў школу,
У светлы адчынены клас.

все учебники на www.slovo.ws

Песням і гульням вясёлым
Ты навучыся ў нас.

Жале́йка — беларускі і рускі народны музычны інструмент у выглядзе дудкі.

1. Чаму аўтар называе восень чарадзейкаю?
2. Як вы разумееце выдзеленыя радкі верша?
3. Якія словы дапамагаюць уявіць восень як жывую істоту? Прачытайце.
4. Прачытайце верш выразна. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [дз'], [ч].
5. Апішыце сваімі словамі:

«Восень у парку» — I варыянт; **словы для выкарыстання:** апалае лісце, дрэвы і кусты, жоўтае лісце, букеты, экскурсія, дзеці, цішыня, укрыла зямлю.

«Восень у агародзе» — II варыянт; **словы для выкарыстання:** сабралі, багаты, лісце, ураджай, пажоўкла, апусцелі, гародніна, цыбуля, капуста, агурочнік, морква, бульба, градкі, засталася.

все учебники на www.slovo.ws

Восень на парозе

Уладзімір Ягоўдзік

Учора з раніцы і да самага вечара дажджыла. А сёння зусім па-ліпеньску спякотлівы дзень. І цішыня. Толькі дзесьці звонка цінькаюць сінічкі. Помніце такую прыказку: «У верасні сініца ў госці восень запрашае»?

Восень — на парог, а шматлікае крылатае войска — у вы́рай. Першымі ў заморскія краіны адлятаюць стрыжы і ластаўкі. За імі ў няблізкую дарогу выпраўляюцца пліскі, буслы, шпакі... А ў канцы верасня чуюцца самотныя трубныя крыкі жураўлёў.

Само́тныя — сумныя, журботныя, адзінокія.

Вы́рай — цёплы край, куды ляцяць на зіму птушкі.

Пліска — невялікая птушка з доўгім хвастом з атрада вераб'іных.

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

1. Які настрой выклікаў у вас гэты твор? Чаму?
2. Якія восеньскія прыкметы апісваюцца ў тэксце? Зачытайце.
3. Як вы разумееце прыказку: «У верасні сініца ў госці восень запрашае»?

?

4. Якія карціны вы намалявалі б да тэксту?
5. Чаму так называецца твор? Паразважайце.
6. Прачытайце твор. Пастарайцеся перадаць восеньскі настрой гэтага твора. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [дз'], [дж], [р].

SLOVO.WS

Прыказка

Жураўлі ляцяць высока — зіма яшчэ далёка.

все учебники на www.slovo.ws

Адлёт жураўлёў

Якуб Колас

Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі.

У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі ў вырай
Мкнуцца над лясочкам.

SLOVO.WS

Мкнуцца — імкнуцца, хутка рухаюцца.

1. Які настрой выклікае гэты верш? У якіх словах ён перадаецца? Прачытайце.
2. Як ласкава аўтар называе «радок» жураўлёў? Як вы гэта ўяўляеце?
3. У якім тэмпе трэба чытаць першы слупок верша? Якія словы падказваюць гэта? Зачытайце.
4. Вывучыце верш на памяць.

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

Разгледзьце малюнкі. Адкажыце на пытанні:

1. Куды пайшлі дзеці?
2. Што здарылася з хлопчыкам Паўлам?
3. Як паводзіла сябе дзяўчынка Алеся?

все учебники на www.slovo.ws

4. Хто выручыў дзяцей з бяды?
5. *Складзіце вусна апавяданне па малюнках. Прыдумайце загаловак.

? **Словы для выкарыстання:** дзеці, лес, пайшлі, у, грыбы, заблудзіўся, гукала, дзядуля, сабака Дружок, радасная сустрэча, кошыкі, поўныя, многа.

Чаму Волечка не сарвала кветку

Васіль Сухамлінскі

Раніцай Волечка ішла ў школу. Каля дарогі яна ўбачыла рамонак.

Ой, які прыгожы! Волечка працягнула руку, каб сарваць кветку і занесці ў школу. Але раптам яна ўбачыла на пялёстачку кропельку расы. А ў кропельцы — сонца. І блакітнае неба, і высокая таполя — усё ў кропельцы!

Заглядзелася Волечка на чароўную расінку і не сарвала кветку.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

?

1. Чаму Волечка не сарвала кветку? Пацвердзіце словамі з тэксту.
2. Знайдзіце і прачытайце самыя важныя, на вашу думку, сказы ў тэксце.
3. Прачытайце тэкст самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [дз’], [р], [ч].
4. Перакажыце апавяданне сваімі словамі.
5. Прадоўжыце гэтае апавяданне.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Хлебныя крошкі

Мікола Янчанка

Я неахайна адламаў кавалак хлеба. Крошкі так і пасыпаліся на падлогу.

Убачыла гэта бабуля і абу́рылася:

— Ты што, хочаш голад наклікаць?

— Як гэта — голад? — здзівіўся я.

— А так. Падбярэ крошкі павук і па сваёй павуціне на ліпу палезе. Так і даведаецца сонца, што людзі яго дары́ не шану́юць. Разлуецца. І спаліць гарачымі промнямі жыта на полі. Вось і пачнецца тады голад.

все учебники на www.slovo.ws

Спалохаўся я. Бач, якую бяду мог наклікаць. Таму адразу папрасіў прабачэння:

— Даруй, бабуля! Больш так рабіць не буду.

— Ведаю, што не будзеш,— палагаднéла бабуля.— А калі захочаш хлеба — вазьмі нож і адрэж скíбачку. Цяпер жа збяры гэтыя крошкі ў жменьку ды курыцы аднясі. Яна табе яечка знясе.

Абýрылася — разгневалася.
Палагаднéла — падабрэла.
Шанýюць — беражліва адносяцца, берагуць што-небудзь.

1. Чаму абурылася бабуля на ўнука?
2. Што бабуля расказала ўнуку? Прачытайце.
3. За што ўнук папрасіў прабачэння ў бабулі?
4. Чаму вучыла бабуля хлопчыка?
5. Якую карціну вы намалявалі б да тэксту? Апішыце яе словамі.

все учебники на www.slovo.ws

Што ў народзе скажуць,
Як у вузел звяжуць...

slovo.ws

Калыханкі

* * *

Люлі, люлі, люлі!
Прыляцелі гулі,
Селі на варотах
У чырвоных ботах...

* * *

Баю, баю, баенькі,
Люлі, люлі, люленькі,

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

Прыляцелі гуленькі,
Селі яны ў люленькі.
Сталі яны буркава́ць,
Малютачку калыхаць...
Маўчы, маўчы, не крычы.

Буркава́ць — утвараць характэрныя для галубоў гукі; лагодна і пяшчотна размаўляць.

1. Якімі словамі звычайна пачынаюцца калыханкі?
2. Прачытайце ласкавыя словы ў калыханцы.
3. Выберыце адну з калыханак і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.
4. *Паспрабуйце праспяваць адну-дзве калыханкі.

все учебники на www.slovo.ws

Забаўлянкі

* * *

Кую, кую ножку.
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.

* * *

— Ладу-ладу-ладкі,
Дзе былі?
— У бабкі.
Бабулька казала,
Як нас частава́ла:
— Прыходзьце часцей,
Пачастую ляпей.

Частава́ць — даваць або прапаноўваць паесці, папіць; пакарміць.

? 1. Пра што ідзе гаворка ў забаўлянках?
2. Калі іх выконвалі?
3. З якім настроем трэба чытаць забаўлянкі?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Заклічкі

* * *

Дожджык, дожджык, секані,
Я паеду на кані.
Дожджык, дожджык, перастань,
Я паеду на Растань.

* * *

Божая кароўка,
Паляці на небка,
Там твае дзеткі
Каштуюць катлеткі,
Квасам запіваюць,
Хлебам заядаюць.

Каштава́ць — спрабаваць ежу.

?

1. Як вы разумееце сэнс слова «заклічкі»?
2. Што прасілі дзеці ў дожджыка? У божай кароўкі?
3. Якім тонам трэба чытаць заклічкі?
4. Вывучыце адну з іх (на выбар) на памяць.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Прыказкі

- Вясенні дзень год корміць.
- Восень кажа: «Ураджу», а вясна кажа: «Яшчэ пагляджу».
- Добраму госцю вароты самі расчыняюцца.
- Дожджык вымачыць, а сонейка высушыць.
- З кім павядзешся, ад таго і набярэшся.
- На хаценне ёсць цярпенне.
- Пад ляжачы камень вада не цячэ.
- Работа і корміць, і поіць, і жыць вучыць.
- Слова не верабей: вылеціць, не зловіш.
- Узімку сонца свеціць, ды не грэе.
- Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць.

1. Прачытайце прыказкі і растлумачце сэнс адной з іх (на выбар).
2. *Выберыце адну з прыказак, што найбольш падыходзіць да прачытаных раней твораў.
3. *Па адной з прыказак паспрабуйце скласці невялікае апавяданне.

slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

У зімы і лета свае прыкметы

- Восень — работ восем.
- Навальніца ў верасні — восень будзе цёплая.
- Гусі ляцяць — зімачку на хвасце цягнуць.
- Зіма без снегу — не быць хлебу.
- Якая зіма, такое і лета.
- Студзень зямлю студзіць.
- Вясна багата кветкамі, а восень — палéткамі.
- Грак на гары — вясна на двары.
- Красавік з вадою — май з травою.

Палéтак — участак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы.

1. Як вы разумееце сэнс загалоўка?
2. Ці выкарыстоўваеце вы гэтыя прыкметы ў жыцці? Дзе? Калі? Для чаго? Пацвердзіце прыкладамі.
3. Прачытайце прыкметы пра восень і растлумачце, як вы іх разумееце.

все учебники на www.slovo.ws

4. *Да якога твора, які мы вывучалі раней, падыходзіць прыкмета пра восень? Знайдзіце і прачытайце назву гэтага тэксту.
5. Вывучыце на памяць прыкметы, якія вам спадабаліся.

Лічылкі

* * *

Пятро, Пятро,
Падай вядро.
Карове піць,
Табе жмурыць.

* * *

Кацілася торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, пшаніца,
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

все учебники на www.slovo.ws

Жмурыць — прыкрываць, заплюшчваць вочы, гуляючы ў жмуркі.

1. Калі ўжываюцца лічылкі?
2. Якія лічылкі вы звычайна выкарыстоўваеце ў гульнях?
3. Пры чытанні лічылак звярніце ўвагу на тэмп і тон слоў.
4. Вывучыце адну (на выбар) лічылку на памяць.

Скорагаворкі

Гавары — не спяшайся,
і глядзі — не памыляйся!

- Вадавоз вёз ваду ад водаправода.
- Дзятлы дзюбамі дзяўблі дрэвы.
- Занадта многа ножак у сараканожак.
- Тры дрывасекі на трох дварах дровы сякуць.
- Хварэў, хварэў, перахварэў, ды нарэшце хваробу вылечыў.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

- Тчэ ткач тканіну на хустачку Яніне.
- У чаплі чапляня, у зайкі зайчаня.

Нарэ́шце — пасля ўсяго, напаследак.

1. Прачытайце скорагаворкі спачатку павольна, а потым хутка.
2. Выберыце адну-дзве скорагаворкі, якія вам спадабаліся, і вывучыце іх на памяць.

Дакучлівая байка

— Расказаць табе дакучлівую байку?

— Раскажы!

— Ты кажаш — раскажы, і я кажу — раскажы. Расказаць табе дакучлівую байку?

— Раскажы!

— Ты кажаш — раскажы, і я кажу — раскажы. Расказаць табе дакучлівую байку?

— Не! Ты кажаш — не, і я кажу — не. Расказаць табе дакучлівую байку?

(І далей спачатку.)

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

?

1. Чаму такую байку называюць дакучлівай? Чаго ў ёй многа, а чаго мала?
2. Як чытаць дакучлівую байку?
3. Прачытайце байку самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [р], [ч].
4. Размяркуйце ролі ў байцы і прачытайце яе.
5. Вам падабаецца гаварыць поўна, кароткa, ясна, выразна, змястоўна, хутка, павольна, свядома? Чаму?

SLOVO.WS

Казка

Вось паслухай, зрабі ласку:
Раскажу табе я казку...

Якуб Колас

Коцік Петрык і мышка

Аднаго разу коцік Петрык захацеў мышку злавіць. Ён быў яшчэ маленькі, але чуў ад дарослых катоў, што яны заўсёды ло-

все учебники на www.slovo.ws

вяць мышэй. І Петрыку вельмі ж захацелася стаць хутчэй дарослым.

Пайшоў ён у гумно. Хадзіў сюды-туды — нікога няма. Раптам у кутку нешта зашамацела. Петрык скокнуў туды і ўбачыў маленькага звярка.

— Ты хто? — спытаў Петрык.

— Мышка.

— Вось ты мне і патрэбна.

— Навошта?

— Я не ведаю навошта, але ведаю, што катам трэба лавіць мышэй.

Мышка пасмялела і кажа:

— Каты ловяць мышэй, каб гуляць з імі ў «Кошкі-мышкі». Хочаш, навучу цябе?



все учебники на www.slovo.ws

— Хачу! — сказаў коцік.

— Тады стань у куток, заплюшчы вочы і лічы да трох, а потым лаві мяне.

Спадабалася гульня Петрыку. Ён стаў у куток, заплюшчыў вочы, а калі далічыў да трох, мышкі было ўжо не дагнаць...

?

1. Ці ведаеце вы гульню «Кошкі-мышкі»? Раскажыце пра яе.
2. На якую хітрасць пайшла мышка?
3. Што з гэтага выйшла? Прачытайце канцоўку казкі.
4. Перачытайце казку і падрыхтуйцеся да выразнага чытання размовы коціка з мышкай.
5. *Прачытайце казку яшчэ раз. Падзяліце яе на часткі па плане:
   1. Коцік Петрык захацеў стаць дарослым.
   2. Сустрэча з мышкай.
   3. Гульня.
6. Падрыхтуйцеся да пераказу адной з гэтых частак блізка да тэксту (на выбар).

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Снег іскрыцца пад нагамі...

Зоська Верас

SLOVO.WS

Сонца свеціць...

Зоська Верас

Сонца свеціць
там над намі,
снег іскрыцца
пад нагамі,
мароз цісне,
дакучáе,
а наш Янка
і не дбае:

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

з гор на саначках
нясецца —
гараць вочкі,
сэрца б’ецца.

1. Хто рады зіме? Як гэтая радасць перадаецца ў вершы? Якія словы ўказваюць на радасны настрой? Прачытайце.
2. Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да чытання ўголас. Пры чытанні перадайце свае адносіны да зімы.

все учебники на www.slovo.ws

Лясная госця

Расціслаў Бензярук

I

Набліжаўся Новы год. Аднойчы, калі моцна разгулялася мяцеліца, нехта пастукаў у акно. Дзеці адарваліся ад падручнікаў і ўбачылі прыгожую лясную госцю.

— Ёй холадна на марозе,— пашкадавала адна дзяўчынка.— Трэба пусціць у клас, няхай пагрэецца.

— Госці, напэўна, цесна будзе ў нашым класе,— заўважыла настаўніца.

— Давайце запросім яе ў спартыўную залу,— пачуліся галасы.— Там прасторна і цёпла.

II

Так і зрабілі. Абагрэўшыся, лясная госця засумавала.

— Хочацца мне да сяброўкі бярозы, да рабіны ў чырвоных карáлях,— сказала яна.

Задумаліся дзеці, як развесяліць госцю.

все учебники на www.slovo.ws

— Давайце ўпрыгожым яе,— прапанавала настаўніца.

Дзеці павесілі розныя цацкі, цукеркі, яблыкі. Але госця ўсё роўна не радавалася:

— Да мяне часта прыбягалі і заяц-бяляк, і вавёрачка, і ліса, а зараз нікога няма.

— Будуць у цябе і звяркі,— паабяцалі дзеці.

все учебники на www.slovo.ws

III

Яны зрабілі маскі зайца, вавёркі, лісы. А калі прыйшлі Дзед Мароз і Снягурка, пачалі вадзіць карагод, спяваць песні. Развесялілася лясная госця і вырашыла кожны раз пад Новы год прыходзіць да дзяцей.

Думаю, вы здагадаліся ўжо, як завуць лясную госцю.

Карáлі — упрыгожанне з каралавых або іншых каштоўных камянёў.

SLOVO.WS

?

1. Ці здагадаліся вы, як звалі лясную госцю?
2. Дзе адбывалася дзеянне: у лесе, у класе, на вуліцы, на спартыўнай пляцоўцы?
3. Як вырашылі дзеці развесяліць ёлку?
4. Як вы разумееце выразы: «лясная госця», «вадзіць карагод»?
5. Чаму развесялілася лясная госця?
6. Прачытайце тэкст па частках і да кожнай з іх падбярыце назвы.
7. Перакажыце тую частку твора, якая найбольш спадабалася.

все учебники на www.slovo.ws

Все учебники на www.slovo.ws

• Самыя вясёлыя зімовыя святы — Новы год і Каляды. З гэтымі святамі нашы продкі звязвалі надзеі на шчаслівае жыццё.

Цудоўныя святы

Васіль Жуковіч

Вялікую радасць
на вуліцы, у хаты
прынеслі Каляды,
зімовыя святы.

Прынеслі забавы,
і жарты, і песні,
загадкі, і гульні,
і танцы прынеслі.

Не спі, пані скрыпка,
і, бубен, прачніся —
цудоўныя святы
ў нас пачаліся.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

1. Пра якое свята гаворыцца ў вершы?
2. Што вы пра яго ведаеце? Як адзначаюць гэтае свята ў вашай сям'і? Раскажыце.
3. Якую радасць прыносяць у хаты Каляды? Прачытайце.
4. Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся чытаць уголас. Падумайце, які настрой вы хочаце перадаць пры чытанні верша.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Зіхатлівыя сняжынкі

Пятро Сушко

Па зямліцы Дзед Мароз
Поўны мех сняжынак нёс.
Рассяваў іх па палях,
Па лясах і па лугах,

Рассяваў па ўсіх сцяжынках
Зіхатлівыя сняжынкі,
Каб святлей было на свеце,
Каб гулялі з імі дзеці.

1. Якім вы ўяўляеце сабе Дзеда Мароза, прачытаўшы верш?
2. Дзе рассяваў Дзед Мароз сняжынкі? Для чаго? Прачытайце.
3. На што апускаюцца сняжынкі ў лесе?
4. Што ўтвараюць сняжынкі на палях, лугах?
5. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша. Правільна вымаўляйце словы з гукам [дз'].
6. Паназірайце за сняжынкамі. Якія яны па форме, па колеры? Намалюйце кожны сваю на паперы.

все учебники на www.slovo.ws

Свой заяц у лесе

Артур Вольскі

I

Сярожа сядзеў побач з вадзіцелем і глядзеў, як паўзе пад колы пабялелая стужка асфальту, выхапленая з цемры фарамі. Спачатку гэта было цікава. Сярожа ўяўляў, што ён сам сядзіць за рулём на шафёрскім месцы. Потым яму гэта надакучыла.

Прахапіўся ён ад раптоўнага крыку:

— Заяц! Заяц!

Хлопчык сапраўды ўбачыў зайца. Ён лясцеў перад самай машынай. У яркім святле фараў мільгаў яго кароценькі белы хвосцік...

slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Сон як рукой зняло.

Сярожаў знаёмы, Саша, кінуўся з задняга сядзення наперад.

— Хутчэй! Хутчэй! — крычаў ён шафёру.— Дагані яго!..

II

Шафёр націснуў на педаль газу і ніжэй схіліўся да руля. Твар яго зрабіўся суровы, нават жорсткі. У вачах з'явілася нешта драпежнае. Сярожу здалося, што ён падобны зараз да каршуна, які высачыў бездапаможную здабычу.

Заяц то сціскаўся ў шэры камяк, то выпростваўся, як адпушчаная спружына.

«Чаму ён не збочыць з дарогі? — не мог зразумець Сярожа.— Там жа кусты... ратунак...»

А зайцу цемра за межамі святла ад фараў здавалася, напэўна, чорнай сцяной. І ён праставаў далей, па асветленай паласе, як па вузкім калідоры. Амаль пад самымі коламі...

— Давай, давай! — не сунімаўся Саша.— Левым яго, левым!..

все учебники на www.slovo.ws

III

Сярожу стала невыносна шкада гэтую бяскрыўдную шэранькую істоту.

— Не трэба! — закрычаў ён на ўвесь голас.— Не трэба!

І ўчапіўся абедзвюма рукамі ў дужую руку шафёра.

Машына тузанулася і стала. Зрабілася так ціха, што Сярожа адчуў нават, як гучна б'ецца яго сэрца.

А шафёр паклаў сваю руку на Сярожавы плечы, зусім як роўнаму, і сказаў:

— Лічы, брат, што ў цябе ёсць цяпер свой заяц у лесе...

?

1. Хто вам спадабаўся ў апавяданні, хто — не? Чаму?
2. Чаму «Сярожу стала невыносна шкада гэтую бяскрыўдную шэранькую істоту»?
3. Як выглядаў твар шафёра ў час пагоні? Прачытайце.
4. Якія словы і выразы перадаюць хваляванне хлопчыка? Прачытайце.

все учебники на www.slovo.ws

5. Што зрабіў Сярожа, каб выратаваць зайца? Зачытайце.
6. Прачытайце апошнія радкі апавядання і задумайцеся, чаму так сказаў шафёр.
7. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання тэксту.
8. Знайдзіце і прачытайце словы, якімі можна падпісаць малюнак.

Зімовая азбука

Міхась Даніленка

Прыйшоў з лесу Юркаў бацька, павесіў на сцяну стрэльбу і сказаў:

— Каля Мажэйкавай паляны ліса мышкавала.

— А як ты дазнаўся? — пытаецца Юрка.

— Азбука такая ёсць,— хітра прыжмурыў вока бацька.— Хочаш, заўтра пойдзем у лес — навучу разумець тую азбуку.

І вось ідуць яны ўдвух: наперадзе бацька, ззаду Юрка. А ўсюды на некранутай роў-

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

нядзі снегу — сляды і сляды. Трапляюцца маленькія — крыжыкам — і такія, нібы хто ўторкваў палку ў глыбокі снег.

— Гэта сарокі падбіралі насенне з дрэў. Бачыш: доўгімі хвастамі за сабой чыркалі, — тлумачыць бацька.— А там вунь і лясная мыш ланцужкі слядоў нанізала.

Заяц скача шырока — заднія ногі ў яго доўгія. І вось на снезе адбіткі яго слядоў — спяшаўся, мусіць, даўгавухі або ўцякаў ад галоднай лісы...

Усё відаць на снежнай коўдры: і як цецерукі начавалі ў пульхным снезе, і як капытом грукаў лясны волат лось — праломваў

все учебники на www.slovo.ws

тонкі лядок у ручайку, каб напіцца, і як таўкліся каля дарогі галодныя вароны — падбіралі рассыпаныя зярняткі аўса.

— Вось яна — зімовая азбука,— сказаў бацька.— Вучыся чытаць яе: усе таямніцы табе лес раскрые.

1. Пра якую зімовую азбуку гаворыцца ў апавяданні?
2. Ці можна яе назваць азбукай жыцця жыхароў зімовага лесу? Чаму?
3. Якой азбуцы вучыў бацька Юрку?
4. Як вы разумееце апошнія радкі тэксту? Прачытайце іх.

?

5. Сляды якіх птушак вы бачылі зімой каля хат, дамоў? Раскажыце.
6. Прачытайце апавяданне яшчэ раз і выберыце сказы:
   — пра зімовыя забавы;
   — пра жыццё звяроў зімою;
   — пра жыццё птушак зімою;
   — пра таямніцы лесу.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Зіма

Пятрусь Броўка

Ой, зіма, зіма, зіма!
Весялей цябе няма!
Горка, санкі, гоман, смех.
Сіні вечар. Белы снег.

Усе дзеці на каньках,
Колькі радасці ў вачах!
Мчаць уздоўжкі, папярок,
Як вýлей, гудзе каток.

SLOVO.WS

1. З якім пачуццём апісвае Пятрусь Броўка зіму?
2. Які настрой у дзяцей? Дакажыце словамі з верша.
3. Як вы разумееце выраз: «Як вýлей, гудзе каток»?
4. Прачытайце верш шэптам і падрыхтуйцеся чытаць уголас. Перадайце пры дапамозе інтанацыі свае адносіны да прачытанага.
5. Вывучыце верш на памяць.

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні:

1. Якая стаіць пара года?
2. Куды прыйшлі дзеці? Чым займаюцца?
3. Хто бегае каля дзяцей?
4. Чаму дзецям так весела?

все учебники на www.slovo.ws

5. *Складзіце вусна апавяданне «Зімовыя забавы».

? **Словы для выкарыстання:** халодная зіма, коўзкі лёд, глыбокі снег, ледзяная горка, сабака Жучок, санкі, добра катацца.

Плыві, рыбка

Мікола Янчанка

I

Прыйшла зіма. Заснежыла лясы, палі і сенажаці. Рэкі закавала. Ды так, што нават імклівыя пераката́ты лёдам пакрыліся. Дзядулю гэта асабліва непакоіла.

— Ведаеш, унучак,— сказаў ён адной-чы Лёньку,— пад лёдам без паветра рыба задыхаецца. Дапамагчы ёй трэба.

— А як жа ёй дапаможаш? — запытаў Лёнька.

— А вось як,— растлумачыў дзядуля.— Мы прасячом у лёдзе «акенцы» — і лягчэй

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

рыбе дыхаць стане. Ведаеш, пойдзем сёння. Пасля заняткаў табе такая прагулка карыснай будзе.

II

Яны ўзялі сякеру і шуфель і пайшлі на раку. Лёнька расчышчаў ад снегу невялікія пляцоўкі, а дзядуля прасякаў там «акенцы». Ён асцярожна высякаў квадратную глыбу і запіхваў яе пад лёд. Потым ачышчаў шуфлем «акенца» ад ледзяных крошак.

І адразу ж сюды збіралася рыба. Плоткі, акункі, ляшчы. Яны высоўвалі галовы з вады, прагна хапаючы ротам паветра.

все учебники на www.slovo.ws

Дзядуля з Лёнькам глядзелі на іх, радаваліся ды гасцінна запрашалі:

— Плыві, рыбка, малая і вялікая!

Да вечара яны прасеклі дванаццаць «акенцаў». Стаміліся, вядома. Але дадому ішлі радасныя.

Пераката́ты — мелкаводныя ўчасткі ракі.
Пра́гна — з вялікім жаданнем, з ахвотай, нецярпліва.

1. Што зацікавіла вас у гэтым апавяданні?
2. Якія «акенцы» і для чаго высякалі дзед з унукам?
3. Як рыбкі паводзілі сябе, калі адкрываліся «акенцы»? Зачытайце.
4. Чаму радаваліся дзядуля і Лёнька? Прачытайце.
5. Разгледзьце малюнак і падбярыце да яго словы з тэксту.
6. *Прачытайце моўчкі першую частку твора і перакажыце яе.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Мароз і гарачыня

Забаўлянка-пазнаванка

Уладзімір Паўлаў

Мяне ў ліпені мароз
Праз кажух даймаў да слёз.
Ды затое ў лютым
Бегаў я разуты.

— Гэта жарт.
— Чаму?
— Ёсць прымаўка: «Пытае люты, ці добра абуты». А вось у ліпені, у сярэдзіне лета, карысна пабегаць і басанож. Асабліва па расе.

? 1. Чым адрозніваецца гэтая забаўлянка ад іншых? Што тут незвычайнага?
2. Знайдзіце на с. 45 прыказку пра зіму і вывучыце яе на памяць.

все учебники на www.slovo.ws

Вясна, вясна жаданая!..

Якуб Колас

SLOVO.WS

Песня аб вясне

Якуб Колас

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары́, ці не?
На пагорках — булі-гулі!
Песні чуюцца вясне.

Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык-ручаёк,

все учебники на www.slovo.ws

все учебники на www.slovo.ws

На яго, бы тая матка,
Сонца кідае свой зрок.

А зіма аж пачарнела,
Годзе ёй тут кросны ткаць!
Ну, маленства, жыва, смела
Выйдзем весну прывітаць!

Кро́сны — ткацкі станок, на якім выраблюць тканіну. У вершы **кросны ткаць** — у значэнні **маляваць узоры.**

SLOVO.WS

1. Якія дзве розныя карціны паэт адлюстраваў у вершы? Якія розныя пачуцці перадаў?
2. Якой паказаў аўтар зіму? А вясну? Якімі вы сабе іх уяўляеце?
3. З чым параўноўвае аўтар ручаёк і сонца?
4. Якімі словамі паэт «ажыўляе» ручаёк, надае яму чалавечыя рысы? Зачытайце.
5. Прачытайце другі слупок верша і намалюйце словамі да яго карцінку.
6. Як вы разумееце словы: «А зіма аж пачарнела, годзе ёй тут кросны ткаць!»?

все учебники на www.slovo.ws

7. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Падумайце, ці аднолькава трэба чытаць радкі верша. Выдзеліце пры чытанні словы, у якіх перадаюцца дзеянні вясны і зімы.
8. На чыім баку, па-вашаму, аўтар? Пацвердзіце словамі з верша.
9. Вывучыце верш на памяць.

Вясна ідзе

Валерый Кастручын

Засмяялася ў небе сонейка і пачало прамянямі лічыць на стрэхах ледзяшы.

— Дзінь-дзінь-дзінь,— як цымбалы, зазвінелі льдзінкі.

Забулькалі, заспявалі пад снегам ручаі. На старой таполі ацерабіўся, замахаў крыламі чорны грак.

«Убачыў грака — вясну сустракай» — кажа прымаўка. Снег у полі пацямнеў, набрыняў і асеў. На ўзгорках чарнеюць

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

праталінкі. У лесе на дрэвах набухаюць пупышкі. Весела звіняць сінічкі на голым вецці. Звонка грукае дзяцел на старой асіне. Грукаў, грукаў, аж разбудзіў мядзведзя. Вылез мішка з берлагу́, пачухаў за вухам, зажмурыўся ад сонца і зароў на ўвесь лес: «Вясна ідзе!..»

Выскачыў з-пад кусціка маленькі зайчык, працёр лапамі вочкі і здзівіўся — лес пацямнеў, елачкі зелянейшыя сталі. Нават

все учебники на www.slovo.ws

маму сваю не пазнаў: скінула яна свой белы кажушок, адзелася ў шэранькую світку і скубе на праталінцы леташні дзя́цельнік.

Наўкола ўсё булькае, звініць і гукае: «Вясна ідзе-е-е!»

Ацерабі́ўся — атросся.
Набрыня́ў — набраўся вільгаці, вадкасці.
Дзя́цельнік — дзікая канюшына.

Сві́тка — вопратка.

1. Ці можна па малюнку вызначыць, аб чым пойдзе размова ў тэксце? Чаму?
2. Якімі словамі аўтар апісвае змены ў прыродзе, што адбываюцца напрадвесні? Прачытайце.
3. Як вы разумееце прымаўку: «Убачыў грака — вясну сустракай»?
4. Знайдзіце на с. 45 прыказку пра вясну і прачытайце яе.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

5. Як звяры паводзілі сябе ў час надыходу вясны?
6. Якімі словамі перадаюцца ў тэксце іх паводзіны? Зачытайце.
7. Знайдзіце і прачытайце тыя словы тэксту, якія падыходзяць да малюнка на с. 76. Дайце назву гэтаму малюнку.
8. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Пастарайцеся пры чытанні ўголас перадаць вясенні настрой гэтага твора.

SLOVO.WS

Паводка

Віталь Вольскі

На рэках не скончылася яшчэ паводка. Рэкі выйшлі з берагоў і злучыліся ў нізінах з лясны мі рэчкамі, раўчукамі і балотамі ў адзіную вялікую вадзяную прастору. Асобныя ўзвышшы ператварыліся ў астраўкі, на якіх ратуюцца ад вады лясныя звяры.

Вось сядзіць пад кустом цэлая грамадка зайцоў. Яны прытуліліся адзін да аднаго.

все учебники на www.slovo.ws

Каля іх можна часам убачыць і лісіцу. Трывожна бегае яна па астраўку, паглядае на ваду, а на зайцоў не звяртае ніякай увагі, быццам іх тут зусім няма.

Калі падплыць да такога астраўка, можна ўсіх гэтых звяркоў пабраць рукамі і

все учебники на www.slovo.ws

пасадзіць у лодку. Яны будуць сядзець ціха і мірна, пакуль лодка не наблізіцца да цвёрдай зямлі. Тады ўсе пасажыры паўскакваюць адразу са сваіх месцаў і, не чакаючы каманды, знікнуць у лесе, не падзякаваўшы нават за ратунак.

1. Чаму зайцы апынуліся на астраўку?
2. Чаму ліса не звяртала на іх увагі?
3. Вы хваляваліся пры чытанні гэтага тэксту? За каго вы хваляваліся больш? Чаму?
4. Чаму звяркоў на астраўку можна нават «пабраць рукамі»?
5. Як адносіцца чалавек да тых, хто апынуўся ў бядзе?
6. *Прачытайце тэкст і падзяліце яго на часткі па плане:
   1. Рэкі выйшлі з берагоў.
   2. Звяркі на астраўку.
   3. Пасажыры ў лодцы.
7. *Падрыхтуйцеся да пераказу. Пастарайцеся расказаць падрабязна, выкарыстоўваючы словы з тэксту.

все учебники на www.slovo.ws

Маміна свята

Васіль Жуковіч

Заўтра свята веснавое —
Восьмага сакавіка.
Што падáрыць маме Зоя,
клапатлівая дачка?

Што падáрыць маме Зоя,
не пытайцеся — сакрэт.
Заўтра, заўтра раніцою
мама ўбачыць свой партрэт.

1. Пра якое свята гаворыцца ў вершы?
2. Што рашыла падарыць маме Зоя?
3. А як вы віншуеце сваю маму?
4. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша. Падумайце, у якім тэмпе яго лепш чытаць, які настрой перадаць.
5. Вывучыце верш на памяць.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws





1. Разгледзьце малюнкі.
2. Вусна складзіце па малюнках апавяданне «Дапамога птушкам», адказваючы на пытанні:

— Калі гэта было?

все учебники на www.slovo.ws

— Што вырашылі зрабіць дзеці?
— Куды яны павесілі шпакоўні?
— Як замацавалі іх?
— Чаму радуюцца дзеці і шпакі?

Словы для выкарыстання: сядзіць шпак, майстэрня, дзеці робяць, шпакоўня, прымацоўваюць, унізе, лесвіца, на галінках, паглядаюць, каля дрэва.

Безбілетная падарожніца

Артур Вольскі

I

Жульцы неаднойчы даводзілася ездзіць з намі ў тралейбусе. Мы часам бралі яе з сабой на работу. Нават у госці. У дарозе яна заўсёды вельмі хвалявалася. Доўга не магла ўседзець на адным месцы. То мне на рукі ўскочыць, то да гаспадыні перабяжыць, то ў Сярожы на каленях уладкуецца.

Аднаго разу кантралёр, правяраючы білеты, пажартаваў:

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

— Безбілетніца! Таму і баіцца, каб не высадзілі, хвалюецца...

Неяк раніцай я пайшоў у магазін па хлеб. І Жулька за мной увязалася. Перайшлі на другі бок вуліцы. А тут якраз тралейбусны прыпынак. І тралейбус падыходзіць. І дзверы адчыняюцца. Не паспеў я і вокам міргнуць, а Жулька — ужо ў тралейбусе. Пабег я за ёй, але дзверы перад самым маім носам зачыніліся. І тралейбус рушыў далей.

Кінуўся я спачатку ўслед. Ды дзе там! Хіба дагоніш...

SLOVO.WS

II

Ну, думаю, усё. Бывай, Жулька!.. Як я зараз дадому вярнуся? Што скажу?

Сумна мне стала. І горка. Нават пра хлеб забыўся. Без пэўнай мэты брыду сабе па вуліцы да наступнага прыпынку. Для ачысткі сумлення. Аж бачу — ляціць мне насустрач белы пуховы камяк і вішчыць на ўсю вуліцу Жульчыным голасам.

Яна! Жулька!

все учебники на www.slovo.ws

А тая з радасці як скочыць з ходу мне проста на грудзі. І лізь сваім гарачым ружовым язычком проста ў нос. Падхапіў я яе на рукі, прыціснуў да шчакі.

Ідуць людзі. Глядзяць на нас. Дзівяцца. Ну і няхай сабе!

А хлеба ў той дзень мы так і не прынеслі.

1. Якія пачуцці ўзніклі ў вас пры чытанні гэтага апавядання?
2. Чаму кантралёр назваў Жульку безбілетніцай? Прачытайце.
3. Што здарылася з Жулькай? Прачытайце.
4. Якія адносіны былі паміж Жулькай і гаспадаром?

?

5. Чаму сумна і горка стала гаспадару?
6. Як радаваліся сустрэчы Жулька і гаспадар?
7. *Перакажыце тэкст па плане:
   1. Жулька ў тралейбусе.
   2. Не паспеў.
   3. Бывай, Жулька!
   4. Сустрэча.

slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Вясенняя раніца

Міхась Чарот

Гляньце, дзеткі, у **аконца**,
Ды пара ўжо **ўставаць**.
Як **прыгожа** там **бясконца**.
Сорам, дзеткі, позна спаць!
Заглянула сонца ў **вочкі**,
Дзень прыйшоў — **даволі сну**.
На свет гляньце, **галубочкі**,
Усе вітаюць там **вясну**.
Зелянее **траўка** ў **полі**.
У небе **птушачкі пяюць**.
Эх! **Зімы** не будзе **болей**,
Хутка **кветкі** зацвітуць.

1. З якім пачуццём аўтар піша пра надыход вясны? У якіх словах гэта найбольш ярка выражана?
2. Якія прыкметы вясны паэт перадаў у вершы? Зачытайце.
3. Да чаго заклікае дзяцей аўтар? Зачытайце.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

4. Як вы разумееце выраз: «Заглянула сонца ў вочкі»? Якую карціну вы сабе ўяўляеце?
5. Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся чытаць уголас. Пры чытанні перадайце пачуццё радасці ў сувязі з надыходам вясны. Больш гучна чытайце выдзеленыя словы.
6. Вывучыце верш на памяць.

Прыйшла вясна

Зоська Верас

I

Хоць мароз яшчэ парою дакучаў ды і снег яшчэ не зняў з зямлі сваёй белай посцілкі, але ж сонейка неяк мацней ужо грэла і залівала ціхія палі і сенажаці.

Яго магутныя прамяні ўпалі і на страху Янкавай хаткі і нават заглянулі праз акенца ўсярэдзіну. Янка адчуў іх цёплую ласку, зразумеў ціхі прызыў і, хуценька апрануўшыся, выбег у садок.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Там яго бацька ўважна аглядаў кожнае дрэва. Ён адпілоўваў сухія непатрэбныя галінкі, а пасля ачышчаў пні і грубейшыя сукі ад моху.

II

Угледзеўшы Янку, бацька весела крыкнуў:

— Што, сынок, сустракаць вясну выйшаў?

— А дзе ж тая вясна? Снег усюды ляжыць. Ды яшчэ гэтак сцюдзёна,— маркотна адказаў Янка, паціраючы пачырванелыя ручкі.

все учебники на www.slovo.ws

— Пачакай, сынок, будзе ўжо цёпла і хораша,— сказаў бацька.— Кожны дзень вясна да нас набліжаецца. Вось з гэтых пучкоў, што бачыш на дрэвах і кустах, вырастуць зялёныя лісточкі. Палі зазелянеюць. Як толькі сыдзе снег з лясных узгоркаў, глянуць на нас з-пад кустоў ляшчыны сіненькія вочкі пралесак. Помніш, колькі іх было летась?

— Я помню, помню, татачка. Дык як закрасуюць пралескі, то ўжо будзе вясна? — пытаўся Янка.

Ён пастаяў яшчэ крыху, падумаў ды пайшоў дахаты.

III

У наступныя дні надвор'е было вельмі кепскае. Дробны дождж барабаніў у вокны ад раніцы да вечара, а вецер згінаў дрэвы аж да зямлі. Доўга прыйшлося сядзець Янку ў хаце. Аж нарэшце аднае раніцы сонейка не-спа-дзя-ва-на выглянула з-за хмар. Хлопчык выбег у садок. Якая перамена! Як цяпер інакш усё выглядала! Снегу не было

все учебники на www.slovo.ws

нідзе ні крышку. Праз жоўтую леташнюю траву прабівалася ўжо свежанькая зялёная траўка. Кусты агрэсту пакрыліся маладзенькімі лісточкамі.

Высока ў небе звінеў жаўранак. А на страсе адрыны стаяў бусел.

Ляшчы́на — тое, што і арэшына.

Адры́на — халодная будыніна для захоўвання кармоў, інвентару.

SLOVO.WS

1. Чаму Янка не верыў, што вясна наступіла?
2. Што на гэта адказаў бацька?
3. Ці задаволіў Янку адказ бацькі? Падмацуйце адказ словамі з тэксту.
4. Як вы думаеце, што хацеў яшчэ спытаць у бацькі хлопчык?
5. Знайдзіце тую частку апавядання, якая адносіцца да малюнка, і прачытайце.
6. *Самастойна прачытайце размову бацькі з сынам. Размяркуйце гэты тэкст па ролях і прачытайце яго.

все учебники на www.slovo.ws

Все учебники на www.slovo.ws

• Вялікдзень — вясновае народнае свята. Падчас яго фарбуюць яйкі, пякуць пірагі. Пад вокнамі хат ходзяць валачобнікі і вітаюць гаспадароў песнямі, пажаданнямі.

Вялікдзень

Васіль Вітка

Траўка бра́цца пачала.
У імша́ніку пчала
Прачнулася і гудзе:
— Хутка ўжо Вялікі дзень!

А людзі між сабою
Пацяшаюцца вярбою.
Ніхто нікога не міне —
Ні цябе, ні мяне.

І мяне, і цябе
Кожны дубцом сцебане́:
— Не я б'ю, вярба б'е,
За тыдзень — Вялікдзень!

все учебники на www.slovo.ws

— І ты, родны народ,
Будзь здароў на ўвесь год!

Імша́нік — уцепленае памяшканне для зімоўкі пчол.
Сцебане́ — хвастане.

?

1. Што вы ведаеце пра Вялікдзень?
2. Як у вашай сям'і рыхтуюцца да Вялікадня?
3. Прачытайце апошнія радкі верша і адкажыце, чаго жадае паэт Васіль Вітка народу.
4. Падрыхтуйцеся выразна чытаць верш. Падумайце, у якім тэмпе яго лепш прачытаць, які настрой перадаць.

slovo.ws

Пчолкі і вясна

Канстанцін Ушынскі

І

Настала вясна, сонца сагнала снег з палёў. У пажоўклай леташняй траўцы праглядвалі свежыя, ярка-зялёныя сцяблінкі.

все учебники на www.slovo.ws

Пупышкі на дрэвах раскрываліся і выганялі маладзенькія лісточкі.

Вось прачнулася і пчолка ад свайго зімовага сну, прачысціла вочкі касматымі лапкамі, разбудзіла сябровак. Выглянулі яны ў акенца разведаць, ці сышоў снег і лёд і халодны паўночны вецер?

II

Бачаць пчолкі, што сонейка свеціць ярка, што ўсюды светла і цёпла, выбраліся яны з вулея і паляцелі да яблынькі:

— Ці няма ў цябе, яблынька, чаго-небудзь для бедных пчолак? Мы цэлую зіму галадалі.

— Не,— гаворыць ім яблынька,— вы прыляцелі вельмі рана. Мае кветкі яшчэ схаваны ў пупышках. Запытайцеся ў вішні.

Паляцелі пчолкі да вішні:

— Мілая вішанька! Ці няма ў цябе кветачкі для бедных пчолак?

— Наведайцеся лепш заўтра,— адказвае ім вішня,— сёння яшчэ няма на мне

все учебники на www.slovo.ws

ніводнай адкрытай кветачкі, а калі адкрыюцца, я буду рада гасцям.

III

Сумныя і галодныя пчолкі хацелі ўжо дадому ляцець, як убачылі пад кусцікам сціплую цёмна-сінюю кветачку. Гэта была фіялачка. Яна адкрыла пчолкам сваю чашачку, поўную водару і салодкага соку.

Наеліся, напіліся пчолкі і паляцелі дадому вясёленькія.

1. Пра якую пару года гаворыць пісьменнік? Чым вы можаце гэта пацвердзіць?
2. Што ўбачылі пчолкі, калі прачнуліся ад зімовага сну? Куды яны паляцелі? Што прасілі пчолкі ў яблынькі і ў вішанькі?
3. Хто выратаваў пчолак ад голаду?
4. Прачытайце моўчкі тэкст і прыдумайце загалоўкі да кожнай часткі.
5. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання другой часткі тэксту. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [ч], [р].

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Тры ка́скі

Васіль Хомчанка

У Андрэйкі ёсць дома дзве каскі. Стаяць яны побач на паліцы.

Адна каска салдацкая. Яе з вайны прынёс дзед. Гэтая каска ўратавала дзеда ад смерці. Бег дзед у атаку — ён быў тады яшчэ не дзедам, а маладым хлопцам, і перад ім выбухнула міна. Секанула асколкамі. Адзін асколак і трапіў па касцы, ударам звалiў салдата на зямлю. Але каска аказалася мацнейшаю за асколак. Жывы застаўся салдат.

Другая каска бацькава, гэта мірная каска. Андрэйкаў тата працуе на будоўлі брыгадзірам. Шмат дамоў збудаваў ён са сваёй брыгадай. У тым ліку і дзе-вя-ці-па-вяр-хо-вы дом, у якім жыве Андрэйка. Калі хлопчык едзе па горадзе, тата яму паказвае ў акно: «Вунь мая школа. Палац культуры мой. І твой дзіцячы сад я таксама будаваў».

все учебники на www.slovo.ws

Бацькава каска ганаровая. Яе называюць залатой каскай і ўзнагароджваюць ёю лепшых рабочых на будоўлях.

Вось гэтыя дзве каскі і стаяць побач.

Дзедава — цёмная, сумная, з драпінамі і ўмяцінамі ад куль і асколкаў, напамінае пра баі, калі дзед абараняў ад ворагаў нашу зямлю.

Бацькава — ярка-аранжавая, вясёлая, сведка таго, як бацька ўзбагачае і ўпрыгожвае Радзіму, уратаваную дзедам.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Андрэйка марыць пра сваю каску, якую ён, як вырасце, будзе насіць. Ён верыць, што гэта будзе каска касманаўта. Дакладней, шлем касманаўта. І абавязкова Андрэйка потым паставіць яго побач з дзедавай і бацькавай каскамі.

І будуць стаяць яны побач, усе тры каскі.

?

1. Пра якія тры каскі расказваецца ў апавяданні?
2. Прачытайце пра каску, якая ўратавала дзеда ад смерці.
3. Чаму бацькава каска была мірнай, гаваровай?
4. Пра якую каску марыў Андрэйка?
5. *Падзяліце тэкст на часткі. Перакажыце адну частку (на выбар).
6. Даведайцеся ў старэйшых (землякоў), хто з іх абараняў Радзіму. Раскажыце пра іх.

SLOVO.WS

все учебники на www.slovo.ws

Садзім алею

Міхась Пазнякоў

Мы ў вясновую нядзелю
Садзім новую алею.
Садзім тут, уздоўж дарогі,—
У гонар свята Перамогі.

Таня — ліпку,
Клім — дубок,
Ясь — каштанік,
Я — клянок.

А Святлана і Наташа
Паліваюць дрэўцы нашы.
Хай расце і зелянее
Наша слаўная алея!

1. У гонар якога свята садзяць дзеці алею? Калі яно адзначаецца?
2. Якія дрэўцы дзеці садзяць? Прачытайце.
3. Што хацеў сказаць чытачам аўтар гэтага верша?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

4. Якія карціны малюе словамі аўтар у вершы? Раскажыце.

? 5. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Правільна вымаўляйце словы з гукамі [дз'], [г].

Ці рака́, ці ра́ка?

Мікола Чарняўскі

Крочыць з вудай Васілёк
Вулічнай сцяжынай.
Дружбакі крычаць здалёк:
— Што злавіў, скажы нам?
Разгубіўся —
Не пазнаць.
Стогне, небара́ка,
Бо не знае,
Як сказаць:
Ці рака́, ці ра́ка?

? Чым адрозніваюцца аднолькавыя па напісанні словы?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Загадкі

Мікола Чарняўскі

* * *

У вячэрняй сіняве
Залаты чаўнок плыве.
Сонца глянула —
Ён знік,
Бо чаўнок той —
... .

* * *

Хто без вілаў,
Без лапаты
Нарабіў буртоў ля хаты,
Ускапаў увесь гарод?
Ну, вядома,
Гэта ... .

1. Што трэба для таго, каб адгадаць загадку?
2. Знайдзіце словы, якія дапамагаюць вам адгадаць загадку. Прачытайце.
3. Складзіце самі загадку і загадайце сябрам.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Аляксей Пысін

SLOVO.WS

Уладзік

Мікола Хведаровіч

Спяшаецца Ўладзік
Са школы дадому:
Ёсць многа работы
Ў хаце малому.

Нямала і клопату
Хлопцу таксама,

все учебники на www.slovo.ws

Бо занядýжала
Ўладзіка мама.

Яна дапамогі
Ў суседзяў не просіць:
Сын дроў нарыхтуе,
Вады сам наносіць,

І посуд памые,
І збегае ў краму —
Бо вельмі шануе ён
Любóю маму.

А потым Уладзік
Урокі рыхтуе,
Рашае задачы,
Малюнкі малюе.

Занядýжала — захварэла.

? 1. Чаму спяшаўся Уладзік дадому?
2. Якую работу хлопчык выконваў дома?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

3. Якая рыса характару хлопчыка вам падабаецца? Чаму? Што вы можаце аб ім сказаць?
4. Чым займаўся Уладзік пасля працы па дому? Зачытайце.
5. Раскажыце, як вы дапамагаеце сваім бацькам.
6. Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання.

?

SLOVO.WS

Гузік

Васіль Хомчанка

Прыйшла Надзя са школы і сказала:

— Бабуля, у мяне гузік адарваўся. Прышый.

— Нясі, унучачка, іголку з ніткай.

Прынесла Надзя іголку і шпульку нітак, аддала бабулі.

— Вочы мае дрэнна бачаць,— сказала бабуля.— Прадзень нітку ў іголку.

Надзя прадзела.

все учебники на www.slovo.ws

— А зараз вазьмі гузік, прыкладзі яго да паліто, вось сюды. Укалі іголку ў дзірачку.Так, правільна. Цяпер у другую.

Надзя рабіла так, як гаварыла бабуля, і не заўважыла, як гузік прышыла. Потым ужо сама агледзела ўсе гузікі на сваім паліто і сукенках. Дзе слаба трымаліся, падмацавала.

— Можа, і табе, бабуля, трэба дзе гузік прышыць? Давай я прышыю.

Знайшоўся такі гузік на ватоўцы — матляўся на адной нітцы. Надзя адарвала яго зусім і прышыла нанава.

— Дзякуй табе, бабуля,— з усмешкай сказала Надзя.

— За што дзякуй? Ты ж сама ўсё зрабіла.

— А за навуку.

все учебники на www.slovo.ws

1. За што падзякавала бабулі Надзя?
2. Як вучыла бабуля ўнучку? Прачытайце.
3. Ці спадабалася вам дзяўчынка? Чаму?
4. *Прачытайце тэкст самастойна. Правільна вымаўляйце слова «гузік». Намалюйце словамі той эпізод, які найбольш вам спадабаўся.
5. Размяркуйце тэкст па ролях і праінсцэніруйце яго.

Стары і яблыні

Леў Талстой

Стары саджаў яблыні. Яму сказалі: «Навошта табе гэтыя яблыні? Доўга чакаць з іх яблычка, і ты не з'ясі яго». Стары адказаў: «Я не з'ем, іншы, хто з'есць, мне дзякуй скажа».

1. Чаму так адказаў стары? Як вы разумееце гэтыя словы?
2. А вы каму-небудзь дзякуеце? Як часта? За што? Раскажыце.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Сям'я

1. Разгледзьце малюнак.
2. Назавіце членаў сям'і. Раскажыце, чым займаецца сям'я. Пачніце так: «Вялікая сям'я сабралася на кухні гатаваць абед...»

?

Словы для выкарыстання: сям'я, дзядуля, бабуля, маці, бацька, дзеці, варыць, чысціць, морква, цыбуля, рыба, рэжа хлеб, суп, гатуе, батон, дзяўчынка, хлопчык, мяшае, смажыць, бульба.

все учебники на www.slovo.ws

SLOVO.WS

Дзень добры, лета

Анатоль Астрэйка

Смяецца, радуецца лета,
Пяюць шпакі і салаўі.
Шуміць пшаніцаю палетак,
І вабяць да сябе гаі.
Дзень добры, лес!
Дзень добры, поле!
Зямная слаўная краса!

все учебники на www.slovo.ws

Дзень добры лісціку на голлі,
Табе, празрыстая раса!
Няхай нас лашчыць,
Цешыць лета,
Пяюць шпакі і салаўі.
Дзень добры,
Аржаны палетак,
Дзень добры,
Родныя гаі!

Аржаны́ — тое, што і жытні.
Гай — невялікі лес, звычайна ліставы.

1. Як паэт гаворыць пра надыход лета? Прачытайце.
2. Што вы ўяўляеце, калі чытаеце гэты верш?
3. З кім вітаецца паэт? Якія словы для гэтага ён ужывае?
4. Ці падабаецца паэту летняя пара? Дакажыце словамі з верша.
5. Ці прыходзілася вам назіраць у прыродзе тое, аб чым піша аўтар? Дзе? Раскажыце.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

6. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання. Падумайце, у якім тэмпе трэба чытаць верш: павольна ці хутка. Правільна вымаўляйце гукі [дз’], [р], [ц].

Птушкі ў чэрвені

Віталь Вольскі

Змаўкаюць птушыныя спевы. У большасці лясных птушак вывеліся птушаняты. Клапатлівыя бацькі безупынна носяць у гнёзды чарвякоў, вусеняў, слімакоў, матылькоў, мушак. Нялёгка ім накарміць дзяцей.

Падлічана, што адна сям’я шпакоў знішчае за дзень каля чатырохсот шкодных садовых слімакоў. А колькі вусеняў, матылькоў, жучкоў!

Вялікае значэнне мае і тое, што птушкі разносяць насенне дрэў і розных раслін. Гэтым яны дапамагаюць росту і развіццю лясоў.

Шанаваць і абараняць птушак, нашых маленькіх вясёлых сяброў і памочнікаў,—

все учебники на www.slovo.ws

абавязак усіх школьнікаў, хлапчукоў і дзяўчынак.

Трэба не толькі самім будаваць для птушак хаткі, але ахоўваць іх, не даваць нікому разбураць гнёзды і крыўдзіць птушанят.

?

1. Чаму трэба абараняць птушак?
2. Як пісьменнік называе птушак? Прачытайце.
3. Прачытайце тэкст самі сабе і падрыхтуйце выказванне пра карысць птушак.
4. Якія птушкі гняздуюцца ў вашай мясцовасці? Раскажыце, што вы ведаеце пра іх.

slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Пчала і муха

Алесь Якімовіч

Жылі-былі пчала і муха. Пчала з ранку да вечара па лугах лятала, мёд збірала. А муха толькі любіла мёд есці. Дзе мёдам запахне — там і яна. А дзе мёду не чуваць — там муха не хоча нават і пераначаваць.

Аднаго разу прысела муха адпачыць на зялёным лузе. Сонейка муху прыгравае, лёгкі ветрык абвявае. Кругом кветкі цвітуць, шустрыя конікі скачуць. У небе птушкі песенькі пяюць.

Задумалася муха: як добра на свеце жыць! Думала-думала ды і задрамала.

А ў гэты час над лугам пчала пралятала. Ляціць, гудзе, мёд у вулей нясе. Цяжка ёй, аж стогне, небарака.

Прахапілася муха ды як закрычыць на пчалу:

— Ах ты, такая-сякая! Чаго тут над вухам стогнеш, мне спаць пе-ра-шка-джа-еш?

все учебники на www.slovo.ws

— Выбачай,— сказала пчала. — Я шмат мёду нясу, дык і стагну.

— Ха-ха,— засмяялася муха,— шмат мёду нясеш, а сама нябось галодная, вунь якая худая — адны косці...

— Праўда,— адказвае пчала,— мы, пчолы, збіраем пудзі, а самі худзі.

— А чаму ж вы худы? І мёд у вас, і вашчына ў вас...

— Дык жа мёд мы збіраем не толькі сабе, а і сваім дзеткам, і гаспадару, які нам хату зрабіў, даглядае нас.

— Чакай, чакай,— кажа муха,— я нешта не зусім цябе разумею: як гэта можна

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

мёд збіраць для іншых? Мы, мухі, так не робім. Мы толькі гатовага мёду шукаем.

— Ат,— замахала крылцамі пчала,— няма мне калі з табою гаманіць: трэба хутчэй дадому спяшацца, мядовую кашку дзеткам варыць.

— А дзе возьмеш ты мядовую кашку?

— На сабе вязу.

— У чым?

— У вазку, у палазкý і за пáзушкай.

Загула пчала ды паляцела ў свой вулей.

Пуд — мера вагі, каля 16 кілаграмаў.

1. Якія моманты ў казцы вам найбольш спадабаліся? Чаму?
2. Якімі паказаны ў творы муха і пчала? Пацвердзіце словамі з тэксту.
3. Прачытайце размову мухі і пчалы. Як вы можаце апісаць пчолку? Пачніце так: «Пчолка з ранку да вечара збірала мёд...»
4. Што ў казцы асуджаецца, а што ўслаўляецца?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

5. У чым галоўны сэнс казкі? Чаму яна вучыць?
6. Знайдзіце ўрывак, да якога зроблены малюнак. Падрыхтуйцеся да чытання па ролях гэтага ўрыўка.
7. Вы калі-небудзь прыдумвалі казкі? Калі так — раскажыце.

У полі

Якуб Колас

Грышка, хлопчык невялічкі,
У поле выйшаў з дому,
Люба там каля крынічкі
Хлопчыку малому!
У гушчары кустоў зялёных
Многа розных пташак,
Кветак белых і чырвоных,
Мошачак, мурашак...

Сядзе хлопчык над крынічкай
І не зварухнецца,

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Пазірае, як над дзічкай
Пташачка снуе́цца
І сваіх маленькіх дзетак
Корміць чарвячкамі.

Эх, як слаўна сярод кветак
Летнімі дзянькамі!..

Снуе́цца — лятае туды-сюды, у розных кірунках.

?

1. Які настрой перадаецца ў вершы?
2. Якімі словамі перадае гэты настрой Якуб Колас? Зачытайце.
3. Чаму люба хлопчыку малому пабыць каля крынічкі? У чым бачыць Грышка прыгажосць прыроды? Прачытайце.
4. Пра што важнае хацеў сказаць паэт у вершы?
5. Як трэба чытаць верш — хутка, павольна, весела або яшчэ як? Чаму? Дзе тон мяняецца? Пацвердзіце словамі з тэксту.
6. Вывучыце верш на памяць.

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws



Разгледзьце малюнак і адкажыце на пытанні:

1. Якая стаіць пара года?
2. Дзе адпачываюць дзеці?
3. Што яны робяць?
4. А як вы адпачываеце летам?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

5. Складзіце вусна апавяданне і дайце яму загаловак.

? **Словы для выкарыстання:** лета, дзеці, выхавальнік, аздараўленчы лагер, гульня, мяч, загараюць, праводзяць, ловяць рыбу, размаўляюць, рака, пясок, плаваюць.

Вось дык суседзі!

Аляксей Якімовіч

Здарылася з Зайкам няшчасце. Бег ён па сцяжынцы, наступіў на востры сучок і параніў лапку. Забралі яго ў лясную бальніцу.

Тыдзень, другі ляжыць Зайка — ніхто з суседзяў не наведвае.

Прыляцела ў лес Варона, закрычала:

— Непр-рыгожа! Непр-рыгожа!..

Сапраўды, непрыгожа. Сабраліся звяры на паляне, каб вырашыць, каму да Зайкі ў бальніцу ісці.

все учебники на www.slovo.ws

— Жонка ў мяне захварэла, кашляе,— кажа Мядзведзь. — Прасіла, каб малінніку наламаў... Можа, ты яго наведаеш, Ліса? Помніш, летась на дзень нараджэння Зайка табе пуховую пярыну падарыў?

Закруціла Ліса хвастом:

— Нара ў мяне пасля дажджу абваліласа. Трэба рамантаваць. Няхай Воўк збегае. Зайка яму новы кажух аддаў, не пашкадаваў.

Завыў Воўк:

— Дома ваўчаняты сядзяць галодныя. У краму пабягу... Няхай Дзік наведае Зайку. Той заўсёды яго жалудамі частаваў.

— А хіба Зубру ён не дапамагаў сена касіць? — зарохкаў Дзік. — Няхай Зубр і сходзіць у бальніцу. У мяне вунь бульба на полі някопаная.

— У мяне ата́ва някошаная,— апусціў галаву Зубр.

Ад шуму ды крыку прачнулася Чарапаха. Яна тут, на паляне, спала. Пытае:

— Чаго спрачаецеся, паважаныя?

все учебники на www.slovo.ws

— Зайка лапку параніў,— загаварыў Мядзведзь.— Ужо два тыдні ў бальніцы ляжыць.

— Бедны Зайка! — пашкадавала Чарапаха.— Сумна яму там аднаму.

— Схадзіла б ты да яго, ад мяне прывітанне перадала,— хітра прыжмурылася Ліса.

— Добра,— пагадзілася Чарапаха.— Пайду.

— Скажы, што і я люблю яго,— напомніў Мядзведзь.

— І ад мяне перадай прывітанне,— рохкнуў Дзік.

— І ад мяне,— падняў галаву Зубр.

А Воўк завыў на ўсё горла:

— І ад мяне не забудзься!.. Пацікаўся, як кормяць яго.

— Не хвалюйцеся. Ад усіх перадам прывітанне. Скажу Зайку, што вельмі чулыя і добрыя ў яго суседзі,— прамовіла Чарапаха і, павярнуўшыся, папаўзла паціхеньку ў бальніцу.

Мабыць, і цяпер яшчэ да Зайкі дабіраецца.

все учебники на www.slovo.ws

Ата́ва — трава ў лузе, якая выросла за лета пасля пакосу другі раз.

1. Пра што гэтая казка?
2. Што здарылася з Зайкам?
3. Чаму Зайку ніхто са звяроў не наведаў у бальніцы?
4. Як вы думаеце, ці дабралася Чарапаха да бальніцы? Чаму?
5. Ці згодны вы са словамі Чарапахі? Зачытайце іх.
6. Размяркуйце казку па ролях і праінсцэніруйце яе.

Алеся і Янка

Песенныя загадкі

Уладзімір Карызна

Каля хаты на мяжы
Выраслі гурочкі.
Каб знайсці іх, трэба мець
Як у Янкі ... .

все учебники на www.slovo.ws

Выйшаў месяц пагуляць,
Сеў каля дарожкі.
Каб з Алесяй ён пабег,
Дайце яму ... .

На світанні за ракой
Заспявалі птушкі.
Каб пачуць іх, трэба мець
Як у Янкі ... .

У гародзе на градзе
Шмат салодкай бручкі.
А каб вырваць, трэба мець
Як у Янкі ... .

1. Прачытайце і адгадайце загадкі.
2. Паспрабуйце праспяваць іх разам з адгадкамі.

slovo.ws
Все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

А чаго ж я вам жадаю?

Кандрат Крапіва

А чаго ж я вам жадаю?
Зараз, зараз прыгадаю...
Каб бадзёрымі былі вы,
каб разумнымі раслі вы,
каб былі здаровы самі,
каб былі здаровы мамы.

І? Чаго добрага вы пажадалі б людзям?

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Адгадкі

С. 17. Званок.
С. 30. Дуб і жалуды. Гарбуз. Бурак.
С. 100. Маладзік. Крот.
С. 121—122. Вочкі. Ножкі. Вушкі. Ручкі.

SLOVO.WS

все учебники на www.slovo.ws

Змест

Не проста ў словы я гуляю —
На мове роднай размаўляю...

Маленькі чалавек у вялікім свеце. Алесь Бадак 3
Беларусачка. Алесь Бадак 6
Я — беларус маленькі. Мікола Маляўка 7
Радзіма. Артур Вольскі 8
Дарагая Беларусь. Леанід Прончак 9

Верасень букеты
Запрасіў у школу...

Развітанне з летам. Мар'ян Дукса 11
Наташын букецік. Нічыпар Парукаў 14
Зазвініць званок. Артур Вольскі 16
Сяброўкі ідуць у школу. Любоў Варанкова 18
Чаму партфель плакаў. Наталля Чарнабай 22
Два таварышы. Леў Талстой 25
Ветлівыя словы. Тадзіяна Кляшторная .. 26
Гульня. Уладзімір Ліпскі 27
Хто я? Сяргей Пагарэлаўскі 29
Загадкі. Міхась Пазнякоў 30

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Мы не заўважылі і самі,
Як восень па зямлі пайшла...

Восень. Вера Вярба 31
Восень на парозе. Уладзімір Ягоўдзік .. 33
Адлёт жураўлёў. Якуб Колас 35
Чаму Волечка не сарвала кветку. Васіль Сухамлінскі 37
Хлебныя крошкі. Мікола Янчанка 39

Што ў народзе скажуць,
Як у вузел звяжуць...

Калыханкі 41
Забаўлянкі 43
Заклічкі 44
Прыказкі 45
У зімы і лета свае прыкметы 46
Лічылкі 47
Скорагаворкі 48
Дакучлівая байка 49
Казка. Коцік Петрык і мышка 50

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws

Снег іскрыцца пад нагамі...

Сонца свеціць... Зоська Верас 53
Лясная госця. Расціслаў Бензярук 55
Цудоўныя святы. Васіль Жуковіч 58
Зіхатлівыя сняжынкі. Пятро Сушко 60
Свой заяц у лесе. Артур Вольскі 61
Зімовая азбука. Міхась Даніленка 64
Зіма. Пятрусь Броўка 67
Плыві, рыбка. Мікола Янчанка 69
Мароз і гарачыня. Уладзімір Паўлаў ... 72

Вясна, вясна жаданая!..

Песня аб вясне. Якуб Колас 73
Вясна ідзе. Валерый Кастручын 75
Паводка. Віталь Вольскі 78
Маміна свята. Васіль Жуковіч 81
Безбілетная падарожніца. Артур Вольскі 83
Вясенняя раніца. Міхась Чарот 86
Прыйшла вясна. Зоська Верас 87
Вялікдзень. Васіль Вітка 91
Пчолкі і вясна. Канстанцін Ушынскі 92
Тры ка́скі. Васіль Хомчанка 95

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws
все учебники на www.slovo.ws

Садзім алею. Міхась Пазнякоў 98
Ці рака́, ці ра́ка? Мікола Чарняўскі 99
Загадкі. Мікола Чарняўскі 100

З чаго чалавек пачынаецца...

Уладзік. Мікола Хведаровіч 101
Гузік. Васіль Хомчанка 103
Стары і яблыні. Леў Талстой 105

Смяецца, радуецца лета...

Дзень добры, лета. Анатоль Астрэйка .. 107
Птушкі ў чэрвені. Віталь Вольскі 109
Пчала і муха. Алесь Якімовіч 111
У полі. Якуб Колас 114
Вось дык суседзі! Аляксей Якімовіч ... 117
Алеся і Янка. Уладзімір Карызна 120
А чаго ж я вам жадаю? Кандрат Крапіва 122

Адгадкі 123

SLOVO.WS
все учебники на www.slovo.ws